# Мемарыяльная палітыка беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі

УДК 930(476)(1921–1939)



**Аляксандр ГОРНЫ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт**

Аляксандр ГОРНЫ. Мемарыяльная палітыка беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі. У айчыннай гістарыяграфіі гэта праблематыка толькі пачынае набываць сваё даследчыцкае поле з выкарыстаннем новых падыходаў і метадаў. Аўтар раскрывае ролю гістарычнай адукацыі і асветы ў палітыцы памяці беларусаў у міжваеннай Польшчы, аналізуе камемарацыйныя практыкі, звязаныя з усталяваннем помнікаў вядомым беларускім дзеячам на могілках і правядзеннем мемарыяльных мерапрыемстваў, вызначае «літаратурную» накіраванасць гістарычнай палітыкі, дзе на першым месцы згадваліся прадстаўнікі беларускай культуры, а не вядомыя палітычныя дзеячы.
Ключавыя словы: Заходняя Беларусь, міжваенны перыяд, беларускі нацыянальны рух, нацыянальнае пытанне, палітыка памяці, камемарацыя.

Aliaksandr GORNY. Policy of memorialization of the Belarusian national movement in Western Belarus. This topic is just beginning to be explored in Belarusian historiography thanks to the use of new approaches and methods. The article looks into the role of history education and enlightenment in the memorialization processes of Belarusians in interwar Poland. The author also analyzes commemorative practices associated with the installation of monuments to famous Belarusian figures on cemetery grounds and organization of memorial events. He points to the heavy impact of the 'literary' dimension on historical research with a focus on cultural figures rather than well-known politicians.
Keywords: Western Belarus, interwar period, Belarusian national movement, national question, memorialization, commemoration.

**Палітыка памяці ўжо даўно з'яўляецца прадметам вывучэння ў замежнай гуманітарнай навуцы, ёй прысвечаны шматлікія публікацыі гісторыкаў, культуролагаў і сацыёлагаў. Распрацаваны цэлы тэрміналагічны апарат вывучэння памяці, куды ўваходзяць паняцці «забыццё», «месцы памяці», «гістарычная траўма» і інш. У айчынных даследаваннях гэта тэма толькі ў апошнія гады пачынае займаць сваю нішу, аднак грунтоўных прац па гістарычнай палітыцы ў розныя перыяды беларускай гісторыі на сённяшні час так і не было падрыхтавана. Актуальным застаецца пытанне фарміравання калектыўнай памяці беларусаў, механізмаў уплыву на яе розных дзяржаўных ідэалогій і гістарычных канцэпцый на працягу вялікага адрэзку часу.**

## ПРА АЎТАРА

ГОРНЫ Аляксандр Сяргеевіч.

Нарадзіўся ў 1988 годзе ў г. Гродне. Скончыў факультэт гісторыі і сацыялогіі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта (ГрДУ) імя Янкі Купалы (2011). З 2018 года – дактарант Інстытута гісторыі НАН Беларусі. У 2020 годзе яму прызначана стыпендыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым вучоным.

З 2015 года працуе ў ГрДУ імя Янкі Купалы на пасадах выкладчыка-стажора, старшага выкладчыка, з 2018 года – дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін, старшыня Савета маладых вучоных.

Кандыдат гістарычных навук (2016), дацэнт (2020).

Аўтар звыш 70 навуковых публікацый, у тым ліку дзвюх калектыўных манаграфій, аднаго даведачнага выдання.

Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя беларускага нацыянальнага руху ў ХХ стагоддзі, палітычная і канфесійная гісторыя Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд, гісторыя беларускай дыяспары, гісторыя паўсядзённасці.

Мемарыяльная палітыка характэрна для ўсіх дзяржаўных утварэнняў і палітычных груп, незалежна ад стадыі іх развіцця і ўзроўню грамадскіх сувязей. Расійскі гісторык А. Мілер падкрэсліваў непазбежнасць рэгулявання памяці палітычнымі актарамі. Паводле яго, палітыка памяці з'яўляецца сукупнасцю розных грамадскіх практык і норм, звязаных з рэгуляваннем калектыўнай памяці, напрыклад, праз камемарацыю (будаўніцтва музеяў, адкрыццё помнікаў, шыльдаў і г. д.), акцэнтаванне ўвагі на адных сюжэтах мінулага і маргіналізацыі іншых, вызначэнне стандартаў гістарычнай адукацыі і інш. *[1, с. 7]*. Пры гэтым не толькі дзяржава можа выступаць рухавіком і заказчыкам гістарычнай палітыкі, яе могуць ажыццяўляць, напрыклад, нацыянальныя рухі, якія імкнуцца да стварэння нацыянальнай дзяржаўнасці. Яшчэ ў XIX стагоддзі французскі гісторык Э. Рэнан адзначыў, што гераічнае мінулае, вялікія людзі ёсць «капітал, на якім асноўваецца нацыянальная ідэя» *[2, с. 65]*.

Беларускі нацыянальны рух фактычна ўжо з пачатку ХХ стагоддзя пачынаў звяртаць увагу на гісторыю як на значны інструмент палітычнай дзейнасці. Тым не менш найбольш паслядоўна мемарыяльная палітыка беларускага руху пачала рэалізоўвацца толькі ў міжваенны перыяд, што было звязана з працэсамі станаўлення беларускай дзяржаўнасці ў 1918–1921 гады. У БССР палітыка памяці ўвабрала ў сябе, з аднаго боку, традыцыі беларускага руху, з іншага – савецкую ідэалогію, што фільтравала калектыўную памяць сваіх грамадзян. У Заходняй Беларусі, якая ўваходзіла ў склад Польшчы да 1939 года, беларускі нацыянальны рух захаваў ранейшыя традыцыі гістарычнай палітыкі і нават удасканальваў іх, але знаходзіўся ў моцнай канкурэнцыі з дзяржаўнай польскай палітыкай памяці. Менавіта вывучэнне вопыту беларускіх актывістаў у Заходняй Беларусі ў працы з мінулым у якасці рэсурсу для будучыні з'яўляецца вельмі актуальным у разуменні сённяшніх праблем калектыўнай памяці беларусаў.

Важным элементам выхавання маладога пакалення заўсёды была гісторыя, з яе дапамогай у беларускіх дзяцей, асабліва ва ўмовах знаходжання ў іншай дзяржаве, канструявалася нацыянальная памяць і фарміравалася ўяўленне аб развіцці ўласнай дзяржаўнасці. У беларускіх пачатковых і сярэдніх школах міжваеннай Польшчы гісторыя Беларусі з'яўлялася абавязковым прадметам з цыкла беларусазнаўчых дысцыплін. Асабліва шырока гэты прадмет выкладаўся ў беларускіх гімназіях. У прыватнасці, у Віленскай беларускай гімназіі гісторыя Беларусі ў тандэме з усеагульнай гісторыяй у 1921 годзе выкладалася з 2-га па 8-ы клас у адпаведнасці з цыклічным падыходам: у другім і трэцім класе чытаўся курс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да перыяду Расійскай імперыі, з чацвёртага па восьмы клас гэты курс паўтараўся ў больш пашыраным выглядзе з дадаткам «гісторыі сучасных часоў» *[3, с. 46–47]*. Згодна з праграмай вучэбнага прадмета вучням прапаноўвалася засвоіць гісторыю першых дзяржаўных утварэнняў на беларускіх землях (Полацкага, Смаленскага і Тураўскага княстваў), гісторыю ВКЛ альбо літоўска-беларускі перыяд, польскую палітыку на тэрыторыі Беларусі ад Люблінскай уніі да падзелаў Рэчы Паспалітай, палітыку Расійскай імперыі на беларускіх землях і станаўленне першых нацыянальна-дзяржаўных інстытутаў пасля 1917 года. Як бачым, гэта праграма цалкам адпавядала перыядызацыі айчыннай гісторыі, якую прапанаваў гісторык У. Ігнатоўскі ў сваім «Кароткім нарысе гісторыі Беларусі», актыўна падкрэсліваючы дзяржаўны фактар у гістарычным развіцці беларусаў. Між іншым гэта кніга перавыдавалася ў Заходняй Беларусі два разы – у 1921 і 1927 гадах – і з'яўлялася асноўным падручнікам для вывучэння гісторыі Беларусі ў беларускіх гімназіях і школах *[4, с. 308, 312]*.

Гістарычная асвета беларусаў у міжваеннай Польшчы не абмяжоўвалася сценамі навучальных устаноў, а пашыралася з дапамогай друкаваных выданняў. Пэўнае месца тут займалі беларускія календары як найбольш папулярны від беларускай кніжнай прадукцыі. Сярод абавязковай інфармацыі асветніцкага характару ў такіх выданнях прысутнічалі гістарычныя ўстаўкі, у прыватнасці «Беларускі гістарычны каляндар» – пералік знакавых дат беларускай гісторыі. Напрыклад, у «Беларускім календары на 1929 год», выдадзеным у Вільні, спіс такіх дат змяшчаў каля сотні пазіцый. На думку аўтараў, гістарычная храналогія беларусаў пачыналася з 862 года – даты з'яўлення «славянскай азбукі», якая была недакладнай і ўжо ў той час аспрэчвалася навукоўцамі. Характэрнай рысай гэтага пераліку была невялікая колькасць падзей ваеннай гісторыі (1410 год – Грунвальдская бітва, 1649-ы – паўстанне на Беларусі), што сведчыла аб нежаданні альбо няўменні беларускіх эліт будаваць нацыянальны наратыў на вобразах пераможцаў і абаронцаў радзімы. З іншага боку, акцэнт рабіўся на рэлігійныя і культурныя падзеі беларускай гісторыі, напрыклад, у календары згадваюцца выбары мітрапаліта Рыгора Цамблака ў Навагрудку, выданне кніг Ф. Скарынам і братамі Мамонічамі, заснаванне Віленскага ўніверсітэта, Пінская праваслаўная кангрэгацыя 1791 года і інш. Практычна палова прапанаваных дат у гэтым календары прыходзілася на ХХ стагоддзе, дзе асноўнымі трыгерамі выступалі падзеі, звязаныя з беларускім нацыянальным рухам і фарміраваннем нацыянальнай дзяржаўнасці. Дзіўна аднак, што знакавыя «месцы памяці» беларусаў,

такія асобы, як Ф. Багушэвіч, Я. Купала, Я. Колас, якія вельмі ўшаноўваліся беларусамі ў міжваенны перыяд, у календары ўвогуле не былі адлюстраваны. Тым не менш рабілася спроба ўпісаць у гістарычны кантэкст падзеі апошніх гадоў, у прыватнасці стварэнне і ліквідацыю Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ) і інш. *[5, с. 42–45]*. Аналіз гэтага пераліку дазваляе пераканацца ў тым, што рэлігійна-культурны дыскурс займаў фактычна вядучае месца ў камемарацыйных практыках дзеячаў беларускага руху ў Заходняй Беларусі. Не апошняе месца таксама належала і захаванню памяці аб беларускай дзяржаўнасці, адлік якой пачынаўся ад Полацкага княства, што ва ўмовах знаходжання ўнутры польскага дзяржаўнага арганізма мела асаблівае значэнне. Як падкрэсліваюць сучасныя даследчыкі, той вобраз мінулага Беларусі, які канструяваўся на старонках беларускіх календароў, можна лічыць найбольш адпаведным светапогляду лідараў беларускага нацыянальнага руху *[6, с. 227]*.


Цана асобнага нумару 20 грош.

БЕЛАРУСКАЯ ДОЛЯ

Выходзіць тры разы ў тыдзень.

№ 20. Вільня, Серада, 25-га сакавіка 1925 г. Год I.

У 400-я угодкі беларускага друку у Вільні.

**Газета «Беларуская доля» (Вільня, 1925 год) з матэрыялам у гонар 400-годдзя беларускага кнігадрукавання**

Асветніцкая і камемарацыйная функцыя гісторыі праяўлялася і ў арганізацыі адмысловых лекцый на гістарычную тэматыку. Лекцыі звычайна мелі папулярны характар, іх маглі арганізоўваць як звычайныя актывісты, так і вядомыя дзеячы беларускага руху, якія цікавіліся гісторыяй і мелі пэўны вопыт даследчыцкай працы. Напрыклад, у пачатку 1936 года па ініцыятыве кіраўніка віленскага гуртка Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры А. Клімовіча ў Вільні быў арганізаваны цыкл лекцый па старажытнай гісторыі Беларусі. Лектар падчас выступлення, у прыватнасці, паказваў, што беларусы спрадвеку жылі на сваёй зямлі, мелі багаты перыяд старажытнай гісторыі і падводзіў да выніку, што сучаснае пакаленне беларусаў мае гістарычныя правы абараняць сваю нацыянальную ідэнтычнасць на роднай зямлі *[7, арк. 3–3 адв.]*. Пры гэтым лекцыйна-асветніцкая дзейнасць абмяжоўвалася не толькі віленскім асяродкам. Так, у лютым 1929 года падчас пасяджэння гуртка ТБШ у в. Малахаўцы Баранавіцкага павета актывіст Іван Кабушка прачытаў рэферат «Першыя пачаткі гісторыі Беларусі», а ў суседняй вёсцы Жарабковічы актывістамі ТБШ чытаўся рэферат «Беларусь пад урадамі Расійскай імперыі» *[8, арк. 66]*. Такім чынам, гістарычныя факты і падзеі рабіліся значным фактарам фарміравання нацыянальнай самасвядомасці нават на правінцыйным узроўні, што дазваляла актывістам падкрэсліваць пераемнасць з традыцыямі мінуўшчыны. Заўважым, што само выкарыстанне паняцця «гісторыя Беларусі» ў назвах лекцый дазваляла людзям ментальна лічыць сябе часткай беларускай супольнасці і аслабляла дамінаванне польскага гістарычнага наратыву, які пашыраўся, напрыклад, праз школьную адукацыю.

Гістарычны рэсурс для распаўсюджвання і захавання нацыянальнай свядомасці ў Заходняй Беларусі актыўна выкарыстоўваўся на адмысловых мемарыяльных мерапрыемствах – сходах, канцэртах, выступленнях у гонар якой-небудзь вядомай асобы беларускай культуры ці гістарычнай падзеі. Месцам правядзення падобных мерапрыемстваў пераважна быў горад Вільня як важны цэнтр беларускага нацыянальнага руху ў міжваенны перыяд. У прыватнасці, у Вільні беларусы адзначалі 400-годдзе беларускага кнігадрукавання (1925), 20-годдзе беларускай прэсы (1926),

400-годдзе І статута ВКЛ (1929), 500-годдзе з дня смерці вялікага князя Вітаўта (1930), 70-годдзе выдання «Мужыцкая праўда» (1933), угодкі смерці М. Багдановіча (1927), І. Луцкевіча (1929), Ф. Багушэвіча (1930), Цёткі (1936) і інш. Звычайна такія мерапрыемствы адбываліся ў наступным фармаце: вядомыя беларускія грамадска-палітычныя ці культурныя дзеячы зачытвалі рэфераты, моладзь дэкламавала вершы, ладзіліся тэатральныя пастаноўкі ці выступленне музычных калектываў *[9]*. Так, падчас урачыстасцей 25-гадовага юбілею літаратурнай творчасці Янкі Купалы, якія адбыліся 27 верасня 1930 года ў зале Віленскай беларускай гімназіі, быў прачытаны рэферат А. Луцкевіча аб творчасці пісьменніка, гімназісты прадэкламавалі вершы Купалы, а вучнёўскі хор праспяваў некалькі песень на вершы паэта *[10, арк. 70]*. Паказальна, што дзякуючы мемарыяльным мерапрыемствам пашыраўся дыяпазон гістарычных падзей, якія дагэтуль былі аддадзены забыццю з розных аб'ектыўных прычын. У прыватнасці, менавіта ў міжваеннай Заходняй Беларусі ўпершыню Статут ВКЛ уводзіўся ў ранг аднаго з беларускіх «месцаў памяці». Тым не менш адных мемарыяльных мерапрыемстваў было недастаткова для «ажыўлення» той ці іншай асобы альбо падзеі ў гістарычнай памяці беларусаў.

Мемарыяльная палітыка любога нацыянальнага руху неразрыўна звязана з фарміраваннем нацыянальнага «пантэона» – сукупнасці пэўных асоб, якія зрабілі значны ўклад у развіццё таго ці іншага народа і разумеюцца гэтым народам у якасці сімвалаў. У міжваеннай Заходняй Беларусі беларускі нацыянальны «пантэон» працягваў традыцыі беларускага руху пачатку ХХ стагоддзя, у адрозненні ад БССР, дзе гэтыя працэсы адбываліся са значнай карэкціроўкай савецкай ідэалогіі. На першым месцы заходнебеларускага «пантэона» знаходзіўся Францыск Скарына. Асоба беларускага першадрукара задавальняла як праваслаўных беларусаў, так і беларусаў-католікаў – гэта быў сімвал аб'яднання беларускага народа, яго творчай энергіі і культурнай самастойнасці. Нездарма беларускі філосаф І. Канчэўскі ў 1921 годзе назваў Скарыну «нашым першым інтэлігентам» *[11, с. 10]*. У адмысловай брашуры, выдадзенай у Вільні да 400-годдзя беларускага кнігадрукавання, ксёндз А. Станкевіч падкрэсліў, што Скарына «вялікі і слаўны беларус… які паклаў асновы пад народны беларускі дом» *[12, с. 104, 125]*.

**Вучні і настаўнікі Радашковіцкай беларускай гімназіі імя Ф. Скарыны падчас святкавання 400-годдзя беларускага кнігадрукавання. 1927 год**
Крыніца: альбом Я. Драздовіча. ЦНБ НАН Беларусі.




«Літаратурная» дамінанта беларускага нацыянальнага «пантэона» падкрэслівалася знаходжаннем там іншых выбітных беларускіх творцаў. Знакавае месца надавалася асобе Францішка Багушэвіча, творы якога сталі для многіх заходнебеларускіх актывістаў пачаткам знаёмства з беларускім нацыянальным рухам. Таму ў грамадскім дыскурсе Заходняй Беларусі замацаваўся канцэпт Багушэвіча як «бацькі ці патрыярха нацыянальнага адраджэння», яго пачынальніка *[13, с. 30]*. У канцы 1920-х гадоў у «пантэон» актыўна ўводзілася постаць Максіма Багдановіча. У 1927 годзе беларускай грамадскасцю шырока адзначаліся дзясятыя ўгодкі смерці паэта: у віленскай Свята-Троіцкай царкве была адслужана паніхіда, у гуртках ТБШ і БІГіК адбыліся ўрачыстыя мерапрыемствы з удзелам тагачасных беларускіх эліт *[14, s. 2]*. Больш за тое, галоўная ўправа ТБШ заклікала зрабіць святкаванне ўгодкаў агульнанацыянальнай справай мемарыяльнага характару, дзеля чаго правінцыйныя гурткі арганізацыі павінны былі набыць партрэты Багдановіча і адмыслова перавыдадзены зборнік вершаў «Вянок» *[15, с. 38]*. Аднак цэнтрабежныя тэндэнцыі

ў беларускім руху ў Заходняй Беларусі ў 1930-х гадах сталі прычынай «забыцця» Багдановіча і змены мемарыяльных акцэнтаў.

Функцыянальным увасабленнем нацыянальнага «пантэона» і палітыкі памяці ў цэлым з'яўляецца наданне розным установам, ініцыятывам, вуліцам імя якога-небудзь гістарычнага дзеяча ці падзеі. У міжваеннай Польшчы гэта палітыка праводзілася вельмі паслядоўна ў сувязі з дэрусіфікацыяй тых тэрыторый, якія раней уваходзілі ў склад Расійскай імперыі. У заходнебеларускіх гарадах і мястэчках старыя «імперскія» назвы вуліц і ўстаноў (Мураўёўская, Аляксандраўская і г. д.) змяняліся на новыя, у гонар польскіх палітычных ці культурных дзеячаў (Ю. Пілсудскага, Я. Сабескага, С. Баторыя, А. Міцкевіча і інш.). Беларускі нацыянальны рух у гэтым плане не мог вытрымаць канкурэнцыі з польскай дзяржавай, але тым не менш спрабаваў заняць сваю пэўную нішу. Пераважна беларускія ўстановы міжваеннай Польшчы насілі імя культурна-асветніцкіх дзеячаў. У гонар Ф. Скарыны былі названы Радашковіцкая беларуская гімназія, беларуская друкарня ў Вільні, беларуская студэнцкая карпарацыя «Скарынія» Віленскага ўніверсітэта і інш. Імя Ф. Багушэвіча было нададзена беларускай настаўніцкай семінарыі ў Вільні і скаўцкай дружыне Віленскай беларускай гімназіі *[13, с. 32]*. Вельмі запатрабаванымі былі імёны народных паэтаў Беларусі, асабліва ў лакальных асяродках. Напрыклад, у в. Вялікая Кракотка Слонімскага павета дзейнічала бібліятэка ТБШ імя Янкі Купалы, а ў в. Чамяры таго ж павета – бібліятэка імя Якуба Коласа *[16; 17, с. 41]*.

Калі вядомыя постаці беларускай літаратуры былі шырока прадстаўлены ў назвах беларускіх устаноў міжваеннай Польшчы, то палітычныя дзеячы ці знакавыя гістарычныя падзеі аказаліся з большага незапатрабаванымі ў мемарыяльнай палітыцы беларускага руху ў Польшчы. Здавалася б, на ўроках гісторыі ў беларускіх гімназіях вывучалі Грунвальдскую бітву альбо полацкіх князёў, аднак на практыцы гэтыя сімвалы не выкарыстоўваліся актывістамі ў якасці гістарычных рэсурсаў. Прычын магло быць некалькі: па-першае, гларыфікацыя мінулага магла выклікаць небяспечную рэакцыю з боку польскіх улад, а па-другое, гэту праблему можна разглядаць праз прызму катэгорыі «забыцця», якое неразрыўна звязана з палітыкай памяці. Нямецкая даследчыца А. Асман адзначала, што «забыццё» ў калектыўнай памяці пэўных груп можа быць выклікана не толькі псіхічнымі механізмамі, але і спланаванымі палітычнымі стратэгіямі, калі некаторыя падзеі ці асобы наўмысна выкрэсліваліся з гістарычных аналаў ці забараняліся *[2, с. 111]*. Таму ўваходжанне беларускіх земляў у склад іншых дзяржаў з уласнай гістарычнай палітыкай (Рэч Паспалітая, Расійская імперыя) паспрыяла мэтанакіраванаму ўздзеянню на сацыяльную памяць беларусаў, што вылілася ў «забыццё» альбо трансфармацыю многіх гістарычных сюжэтаў. Як бачым, пераадолець гэтае «забыццё» ў міжваенны перыяд было яшчэ вельмі складана.

Тым не менш у беларускім руху міжваеннай Заходняй Беларусі рабіліся спробы выйсці за рамкі «літаратурнай» традыцыі. Пэўнае месца ў гэтым працэсе займала асоба Кастуся Каліноўскага. Дзякуючы таму, што ў савецкай Беларусі Каліноўскі стаў адной з галоўных постацей мемарыяльнай палітыкі, у 1930-я гады ў Заходняй Беларусі памяць аб ім набыла новае гучанне. У грамадскім і культурным жыцці пра Каліноўскага згадвалі як левaрадыкальныя дзеячы (М. Танк, М. Дворнікаў), так і прадстаўнікі нацыянальна-дэмакратычнай плыні (кс. А. Станкевіч, М. Машара), што стварала глебу для яго далейшай мемарыялізацыі *[18, с. 123; 12, с. 216]*.

Эпізадычныя спробы пашырыць гістарычны дыяпазон памяці рабіліся правінцыйнымі структурамі беларускага руху. Напрыклад, у крыніцах сустракаюцца сведчанні аб утварэнні пры баранавіцкім гуртку ТБШ спартыўнага клуба «Крывічанка», названага, як бачым, у гонар старажытнага племені, якое пражывала на беларускіх землях *[19, арк. 1]*.

Адной з важных рыс любой гістарычнай палітыкі з'яўляецца ўсталяванне помнікаў і мемарыяльных шыльдаў, што візуальна падкрэслівае сувязь з мінулым і стварае пэўныя месцы для правядзення памятных мерапрыемстваў. Для беларусаў у міжваеннай Польшчы гэта практыка была абмежавана адсутнасцю неабходных рэсурсаў, а таксама адмоўнай пазіцыяй польскіх улад. Больш за тое, беларусы не маглі вытрымаць канкурэнцыю з моцнай дзяржаўнай палітыкай памяці Польшчы: усталяванне помнікаў дзеячам польскай гісторыі і сучаснасці было часткай палітыкі паланізацыі няпольскага насельніцтва. Тым не менш у міжваеннай Польшчы існавала зона, дзе беларусы маглі адчуваць сябе больш свабоднымі ў справе помнікаў – могілкі. У другой палове 1930-х гадоў, калі беларускі рух у Польшчы знаходзіўся ў значным арганізацыйным крызісе, стварэнне мемарыяльных зон на могілках стала новым элементам сувязі пакаленняў і кансалідацыі дэзарганізаванага беларускага грамадства. Заўважым, што надмагільныя помнікі ставіліся пераважна на месцах пахавання культурна-асветніцкіх дзеячаў, што падкрэслівала «літаратурную» арыентаванасць гістарычнай памяці тагачасных беларусаў. Так, 6 чэрвеня 1936 года на віленскіх могілках Роса адбылося ўрачыстае адкрыццё помніка беларускаму ксяндзу і паэту Казіміру Сваяку (Кастусю Стаповічу) на 10-я

ўгодкі яго смерці. Мерапрыемства набыло сапраўдны цырыманіяльны характар – вакол помніка стаяла ўрачыстая варта з беларускіх скаўтаў мясцовай гімназіі, дзіцячы хор спяваў рэлігійныя спевы па-беларуску, выступалі вядомыя прадстаўнікі беларускага руху, у тым ліку ксёндз Адам Станкевіч. Усяго на адкрыцці прысутнічала каля 500 чалавек, пры тым не толькі жыхароў Вільні. На могілкі Роса прыбылі актывісты з Баранавіцкага, Браслаўскага, Лідскага, Шчучынскага, Ашмянскага і іншых паветаў *[20, с. 2]*.

Сапраўднай грамадскай кампаніяй стала ўсталяванне помніка на магіле Ядвігіна Ш. (Антона Лявіцкага) у Вільні. У красавіку 1937 года маладыя беларускія актывісты, якія гуртаваліся вакол рэдакцыі часопіса «Шлях моладзі», пачалі акцыю па збору грошай на помнік пісьменніку. У адмысловым закліку да ахвяравання грошай, апублікаваным у часопісе, адзначалася: «Сёння гэты пачынальнік беларускай прозы, чалавек, які цэлае жыццё пасвяціў беларускай справе… ляжыць пахаваны на віленскіх могілках Роса, а дзярвяны збутвелы крыж над яго магілай з кожным днём хіліцца што-раз ніжэй… Сорам, сапраўды вялікі сорам, усім беларусам, каб у такім стане была магіла нашага песняра» *[21, с. 5]*. Беларусы адгукнуліся на заклік вельмі актыўна: у рэдакцыю пачалі прыходзіць ахвяраванні ад беларускіх дзеячаў рознай палітычнай арыентацыі, што ператварыла збор сродкаў у сапраўдную агульнабеларускую кампанію. Між іншым грошы на помнік выдаткавалі такія вядомыя дзеячы, як Р. Шырма, А. Луцкевіч, А. Станкевіч, В. Багдановіч і інш., а таксама навучэнцы Віленскай беларускай гімназіі, беларускія студэнты Віленскага ўніверсітэта, праваслаўныя і каталіцкія святары, сяляне з в. Рэўкі Скідзельскай гміны. У чэрвені 1937 года было ахвяравана ўжо каля 250 злотых, якіх аднак яшчэ не хапала для поўнага пакрыцця затрат *[22]*. Да верасня неабходную суму сабралі і ў віленскай мастацкай майстэрні А. Бараноўскага быў выраблены помнік Ядвігіну Ш. у выглядзе абеліска з шэрага граніту. Урачыстае адкрыццё помніка адбылося на каталіцкія Задушкі, ці Дзяды, – 2 лістапада 1937 года. У цырымоніі на могілках удзельнічалі беларускі дзіцячы хор, скаўты Віленскай беларускай гімназіі, актывісты з розных заходнебеларускіх гарадоў і вёсак, што вельмі характэрна адлюстроўвала «жывучасць» беларускага нацыянальнага дыскурсу ва ўмовах татальнай паланізацыі. Пасля адкрыцця помніка адбыўся вечар памяці Ядвігіна Ш., на якім адзін з сябраў рэдакцыі часопіса «Шлях моладзі» Я. Шутовіч прачытаў даклад аб яго жыцці і дзейнасці, а беларускія студэнты дэкламавалі ўрыўкі з твораў пісьменніка *[23]*.



**Помнік на магіле Ядвігіна Ш. на віленскіх могілках Роса. Фота з беларускай прэсы 1930-х гадоў**

Як ужо адзначалася, пры фарміраванні гістарычнай палітыкі актывісты беларускага нацыянальнага руху абапіраліся таксама на падзеі адносна нядаўняга часу, якія карысна было ўвесці ў мемарыяльны кантэкст. Яшчэ адным «месцам памяці» магла стаць, напрыклад, Беларуская сялянска-работніцкая грамада – найбольш масавая арганізацыя беларусаў у міжваеннай Польшчы, якая ўзнікла ў 1926 годзе. Папулярнасць БСРГ у правінцыйных беларускіх асяродках была вялікай, нават пасля дэлегалізацыі гэтай структуры польскімі ўладамі, памяць аб ёй яшчэ доўга захоўвалася сярод былых актывістаў. Малавядомым фактам з'яўляецца спроба левaрадыкальных беларускіх арганізацый адзначыць 5-годдзе стварэння БСРГ у 1931 годзе. Напрыклад, у Навагрудскім павеце дзеяч Таварыства беларускай школы і выпускнік Пражскага ўніверсітэта Фёдар Аніськевіч з гэтай нагоды распаўсюджваў сярод насельніцтва адмысловыя медальёны з выявай Б. Тарашкевіча – былога лідара БСРГ *[24, s. 223]*. Аднак арганізацыйны крызіс беларускага руху ў 1930-я гады і ўзмацненне палітыкі паланізацыі прывялі да таго, што памяць аб БСРГ паступова гублялася і не набывала актуальнага аднаўлення. Такая ж сітуацыя захавалася і ў пасляваеннай БССР, дзе Грамада так і не стала знакавым аб'ектам камемарацыі, нягледзячы на свой левaрадыкальны характар.

Падводзячы вынікі, неабходна вылучыць наступныя асаблівасці мемарыяльнай палітыкі беларускага руху ў Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. Па-першае, праз гістарычную адукацыю і асветніцкую дзейнасць беларускія актывісты спрабавалі паказаць пераемнасць традыцый мінуўшчыны і абгрунтаваць справядлівасць барацьбы за захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці. Не апошнюю ролю ў гэтым адыгрывала памяць аб дзяржаўнасці ў беларускай гісторыі, што выхоўвала ў людзях ідэю адраджэння ўласнай дзяржавы. Па-другое, мемарыяльная палітыка насіла з большага «літаратурны» характар – акцэнт рабіўся на постацях беларускай культуры (Ф. Скарына, Ф. Багушэвіч, М. Багдановіч і інш.),

а знакавыя палітычныя дзеячы ці падзеі «забываліся» з розных прычын, нягледзячы на спробы іх ажыўлення. На нашу думку, гэта асаблівасць мела негатыўныя вынікі, бо ішла ў разрэз з памяццю аб дзяржаўнасці, дзе ключавое месца ўсё ж такі павінна належаць палітычным лідарам ці гераічным падзеям. Па-трэцяе, камемарацыйныя мерапрыемствы беларускага руху былі вельмі абмежаваны рамкамі польскай палітыкі ў Заходняй Беларусі і зводзіліся ў асноўным да правядзення мемарыяльных сходаў і ўсталявання помнікаў вядомым літаратарам на могілках. У чацвёртых, рабілася спроба пашырыць мемарыяльную палітыку за кошт падзей сучаснасці, якія аднак так і не прыжыліся ў калектыўнай памяці беларусаў.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 09.03.2022 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Миллер, А. Россия: власть и история / А. Миллер // Pro et contra. – 2009. – № 3–4. – С. 6–23.
2. Ассман, А. Длинная тень прошлого. Мемориальная культура и историческая политика / А. Ассман. – Москва: НЛО, 2014. – 328 с.
3. Адамковіч, А. Беларусы ў Літве: учора і сёння / А. Адамковіч. – Вільня: Таварыства беларускай культуры ў Літве, 2010. – Кн. 1. – 200 с.
4. Туронак, Ю. Мадэрная гісторыя Беларусі / Ю. Туронак. – Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2006. – 877 с.
5. Беларускі гістарычны календар // Беларускі календар на 1929 год. – Вільня: Беларускае выдавецкае таварыства, 1929. – С. 42–45.
6. Сагановіч, Г. Беларускі каляндар у гістарычнай асвеце ў 1910–1939 гг. / Г. Сагановіч // Беларускі гістарычны агляд. – 2015. – Т. 22, сш. 1–2. – С. 209–227.
7. Lietuvos centrinis valstybės archyvas (LCVA). – F. 51. Ap. 17. B. 530.
8. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ). – Ф. 93. Воп. 1. Спр. 2.
9. Прысутны. Сьвяткаваньне 400-лецьця Статуту Вялікага Князьства Літоўскага / Прысутны // Наперад. – 1929. – № 1. – С. 4.
10. LCVA. – F. 53. Ap. 23. B. 2078.
11. Канчэўскі, І. Адвечным шляхам: эсэ, вершы / І. Канчэўскі; укл. Ц. Чарнякевіча. – Мінск: Зміцер Колас, 2021. – 88 с.
12. Станкевіч, А. З Богам да Беларусі: збор твораў / А. Станкевіч. – Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2008. – 1097 с.
13. Горны, А. Францішак Багушэвіч як «месца памяці» беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі / А. Горны // Беларускі гістарычны часопіс. – 2020. – № 5. – С. 29–34.
14. Z Biełaruskaha žyćcia // Biełaruskaja Krynica. – 1927. – Nr 23. – S. 2–3.
15. З Беларускіх культурных арганізацыяў // Родныя гоні. – 1927. – Кн. 3. – С. 38–41.
16. З Вяліка-Кракоцкага Гуртка Т-ва Белар. школы // Наша праўда. – 1927. – № 11. – С. 4.
17. Міско, Я. Маё маўклівае сэрца: з літаратурнай спадчыны / Я. Міско. – Мінск: Юнацтва, 1983. – 493 с.
18. Танк, М. Збор твораў: у 13 т. / М. Танк. – Мінск: Беларуская навука, 2009. – Т. 9. Лісткі календара. Дзённікі (1941–1959). – 592 с.
19. Цэнтральная навуковая бібліятэка НАН Беларусі. Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў. – Ф. 2. Воп. 1. Спр. 55.
20. У 10-тыя ўгодкі сьмерці К. Сваяка // Беларуская крыніца. – 1936. – № 28. – С. 2.
21. Мусім паставіць памятнік Ант. Лявіцкаму // Шлях моладзі. – 1937. – № 4. – С. 5–6.
22. Na pamiatnik Antonu Levickamu ū Vilni // Шлях моладзі. – 1937. – № 6. – С. 20.
23. З. Б. Урачыстасьці ў чэсьць Ядвігіна Ш. / З. Б. // Шлях моладзі. – 1937. – № 15. – С. 4–7.
24. Kontrolować czy likwidować – Komunistyczna Partia Zachodniej Białorusi / wstęp i opracowanie naukowe: Wojciech Śleszyński. – Kraków: Avalon, 2015. – 368 s.